Яе гісторыя насамрэч пра тое, што чалавек не ведае межаў сваіх магчымасцяў і здольны здзяйсняць немагчымае. Рызыкаваць жыццём дзеля любімай справы і пры гэтым гарэзліва ўсміхацца, бо ўсмешка дапамагае перамагчы свой унутраны страх. А на крыкі "стагу" — "вар'ятка" — ветліва махаць рукой... Вольга Корбут — чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка, юная гімнастка, якая зачаравала паўпланеты сваёй бясстрашнасцю і спартыўнай грацыяй, і пасля яе сусветная гімнастыка ўжо ніколі не вернецца да застыласці.

Дзіўна, але Вольга Корбут не выйграла ніводнага міжнароднага спаборніцтва ў мнагабор'і – самым, як лічыцца, галоўным і прэстыжным старце праграмы. Тым не менш, менавіта яна была ўключана ў «Міжнародную залу гімнастычнай Славы» пад №1. Усяго некалькі хвілін спатрэбілася ёй, каб гімнастыка стала самым папулярным відам спорту для мільёнаў людзей паўсёй планеце. На Алімпіядзе-72 у Мюнхене 17-гадовая дэбютантка паказала ўнікальны элемент на брусах: яна станавілася на верхнюю перакладзіну, затым узлятала над ёй, выконваючы практыкаванне «сальта назад", а потым зноў вярталася на гэтук ж перакладзіну. Публіка з замiраннем сэрца глядзела на гэты рызыкоўны палёт.

«Цуд з касічкамі»

КОРБУТ Вольга Валянцінаўна (16.05.1955, Гродна, БССР) – беларуская гімнастка, алімпійская чэмпіёнка, заслужаны майстар спорту СССР (1972). Трэніравалася ў Рэнальда Кныша. Скончыла Гродзенскі педінстытут (1977) па спецыяльнасці «трэнер-выкладчык». Стала спартсменкай №1, што пазначана ў «Міжнароднай зале гімнастычнай славы» ў Аклахома-Сіці (США, 1988). Завяршыла спартыўную кар'еру пасля Алімпіяды ў Манрэалі (1976). Вольга Корбут - першая ў свеце гімнастка, якая змагла выканаць сальта на бервяне. Таксама яна першай выканала ўнікальны элемент «пятля» падчас практыкаванняў на брусах на Алімпіядзе ў Мюнхене (у цяперашні час «пятля Корбут» не выконваецца на афіцыйных спаборніцтвах, бо забароненая правіламі як павышанай траўматычнасці элемент).

Назаўтра газеты застракацілі загалоўкамі: «Цуд з касічкамі», «Улюбёнка Мюнхена", "Рускі верабейка ўляцеў проста ў сэрца заходняй публікі». Кожнае яе новае з'яўленне на гімнастычным памосце сустракалася авацыямі, зала захоплена адклікалася на кожны яе рух, трыбуны дружна скандзіравалі: «Ол-га! Ол-га!»...

Я на прыйшла ў гімнастыку, калі вучылася ў 2-м класе (па сённяшнім часе – позна). Сям'я ў Корбут была шматдзетная: жылі ўпасцёх у пакоі 24 кв. м, без усялякіх выгод, тата працаваў інжынерам, мама поварам, з чатырох сясцёр Оля была самай малодшай і самай любімай. Яе ўпарты характар гартаваўся ў дваровых баталіях. Пры адборы ў мясцовую ДЮСШ яе спачатку не ўзялі: падалася паўнаватай. Аднак на «таўстушку» чамусьці звярнула ўвагу алімпійская чэмпіёнка Алёна Валчэцкая. Магчыма, гледзячы на дзяўчынку, яна адчула яе няскораны ўнутраны супраціў абставінам, што так важна ў спорце.

Праз год Оля стала займацца ў групе заслужанага трэнера СССР Рэнальда Іванавіча Кныша, які трэніраваў таксама і саму Валчэцкую. Менавіта Кныш прывёў да перамог і сусветнай славы "гродзенскага верабейку". Ён хутка зразумеў, што гэтая дзяўчынка з моцным характарам зможа нават немагчымае для іншых. Яна з лёгкасцю асвойвала ўсё новыя і новыя элементы. Маленькая вага дазваляла Вользе падкідваць сябе ў паветра так высока, што часам здавалася, быццам яна, пераадолеўшы зямное прыцягненне, "завісала" ў прасторы. Выдатная каардынацыя рухаў дапамагала дакладна прызямляцца пасля палёту. Аднак сакрэт быў не толькі ў прыродных дадзеных. Каб выканаць тое, што яшчэ ніхто да цябе зрабіць не спрабаваў, патрэбна і адмысловая смеласць, і мэтанакіраванасць, і вялікая любоў да спорту.

Першы вялікі поспех прыйшоў да Вольгі Корбут ў 1970 годзе: у 15 гадоў яна стала чэмпіёнкай СССР у апорным скачку і ўвайшла ў зборную СССР. У 17 гадоў яна паехала на Алімпіяду, дзе ў літаральным сэнсе заваявала сэрцы публікі не толькі сваёй адчайнасцю, калі рабіла сальта назад на брусах (рызыкоўны элемент назвалі «пятля Корбут»), але і шчырасцю, калі плакала наўзрыд пасля пяўдалага выступлення ў мнагабор'і...

У гісторыю спартыўнай гімнастыкі ўвайшло супрацьстаянне Людмілы Турышчавай і Вольгі Корбут. Турышчава ўвасабляла сабой старую акадэмічную гімнастычную школу, тады як Корбут несла ў сабе новыя павевы ў спорце: рызыкоўныя элементы, грацыю і атлетызм, запал юнацтва. Там, у Мюнхене, талевавітая абаяльная Вольга прадэманстравала наватарскія гімнастычныя элементы і стала фаварыткай глядацкіх сімпатый. Аднак у барацьбе за абсалютнае першынство яна прайграла Турышчавай.

Пасля Алімпіяды-72 Вольга Корбут стала мега-зоркай. У 1973 годзе яе запрасілі на гастролі ў ЗША. Выступленні прайшлі трыумфальна, стадыёны паўсюдна былі запоўненыя. З імем Вольгі Корбут звязваюць бум спартыўнай гімнастыкі ў Амерыцы. У разгар халоднай вайны ў самым сэрцы ЗША , горадзе Чыкага, быў афіцыйна абвешчаны Дзень Вольгі Корбут. Трэнера Рэнальда Кныша запрасілі на прыём да прэзідэнта Рычарда Ніксана, які запатрабаваў ад сваіх памочнікаў адзначыць на карце, дзе знаходзіцца "гэты горад Гродна, у якім нарадзілася легенда гімнастыкі".

"Мы ездзілі з паказальнымі выступленнямі па ўсім свеце і бачылі, як на нашых вачах расце папулярнасць спартыўнай гімнастыкі, – пісаў Кныш. – Мне прапаноўвалі працу ледзьве не ў кожнай краіне і ўвесь час прасілі адкрыць сакрэт, як мне ўдалося зрабіць феномен з Вольгі Корбут".

З аўтабіяграфічнай кнігі алімпійскай чэмпіёнкі Вольгі Корбут:

«Перад першымі дзіцячымі спаборніцтвамі нечакана паўстала праблема экіпіроўкі. У школе мы займаліся ў трыко і чэшках, а тут спатрэбіліся спартыўныя купальнікі і белыя тапачкі. Пасля маіх гарачых просьбаў і слёз мама прынесла махровы ручнік, з паперы выразала загатоўку і перанесла яе на тканіну. Так атрымаліся тапачкі, якія пры моцным жаданні можна было прыняць за гімнастычныя. Купальнік зрабілі такім жа саматужным спосабам: маці ўзяла майку з рукавамі большага памеру, крыху абрэзала, падшыла, надзела на мяне і прыкалола знізу шпількай. "Купальнік" гатовы! Як я выступала– ці добра, ці дрэнна– сказаць не магу, таму што я цалкам засяродзілася на шпільцы. Толькі б, думалася, не падвяла, не расшпілілася... Не падвяла!

Памятаю, на п'едэстале побач сталі прыгожыя худзенькія дзяўчаткі з вялізнымі бантамі, і я зайздросціла ім чорнай зайздрасцю, была гатовая нават аддубасіць іх за тое, што яны так прыгожа апранутыя».

Разам з мужам, салістам «Песняроў» Леанідам Барткевічам і сынам Рычардам.

Больш за 20 гадоў Вольга Корбут трэніравала дзяцей у ЗША.

«1972 год. Мюнхен. Казка даўжынёй у два тыдні. Я не магла паверыць: я – алімпійская чэмпіёнка? Я – алімпійская чэмпіёнка ?! Няўжо праўда? Пацалункам, абдымкам, поціскам рук ліку няма. Паліцэйскі на вахце паважна схіляе перада мной галаву і не цікавіцца, куды я ў чарговы раз запіхнула пропуск: «Бітэ, фройляйн Корбут». Гледачы гудуць і абураюцца на арбітраў, якія наважыліся паставіць мне смешныя, на іх думку, 9,6 бала за сальта на бервяне. Пасля спаборніцтваў мяне выносяць з гімнастычнай залы на руках, вакол толькі і чуецца розгалас паклоннікаў: «Ол-га! Ол-га!»... Адчыняю дзверы гасцінічнага нумара і заміраю ў здзіўленні: суцэльная сцяна кветак, на стале і ложку сотні лістоў і тэлеграм. Я бяру ў ахапак лісты і падкідваю іх да столі. Снегапад з канвертаў разляцеўся па пакоі. Нехай жыве гімнастыка! А таксама я!».

«Славутай на ўвесь свет "пятлі Корбут", калі шчыра, я заўсёды баялася. Так-так-так! Заўсёды!!! Да самага апошняга дня ў вялікім спорце я падыходзіла да брусаў – і маё сэрца правальвалася ўглыб ад страху. Думка пра ўцёкі – пра ганебныя ўцёкі пад улюлюканне і свіст залы – кожны раз здавалася мне самаўбойствам разумнай істоты. Але мой трэнер Рэнальд Кныш патрабаваў ад мяне адкідваць проч эмоцыі і страхі.

Як Рэн вучыў мяне пераадольваць страх? Кожны раз, калі на трэніроўцы здаралася падзенне – хай сабе і балючае, калі разбіты да крыві нос або каленкі– трэнер, скончыўшы працэдуры супакаення, змазвання раны ёдам ці нават бінтавання, катэгарычна патрабаваў ад мяне яшчэ раз зрабіць тое, што не атрымалася. Ніякія слёзы, ніякія скаргі, ніякія хітрыкі былі не ў стане пахіснуць яго гэтыя намеры або разжаліць. "Калі не зробіш цяпер – не зробіш ніколі! Перамагай свае боязь і боль, і ты абавязкова адчуеш асалоду перамогі, ты ўсвядоміш, як гэта цудоўна– стаць вышэй за свае слабасці," – казаў Рэн, цягнучы да снарада спартыўныя маты з усёй залы. І я ішла пераадольваць свае страхі».

«Прызнаюся: хаю ўсмешку Рэн ставіў мне з такой жа акуратнасцю і абавязковасцю, як і любы гімнастычны элехент. Пры гэтым «пастаноўка» ішла выключна падчас спаборніцтваў, на трэніроўках я была вольная распараджацца сваім тварам, як заўгодна: хочаш плач, хочаш рагачы, хочаш злуйся... А вось на афіцыйным турніры, будзь ласкавая, галубка Корбут, пакажы, на што здольная. Гэта была не просьба – загад. Стоячы на памосце, я азіралася, шукала Кныша на трэнерскай лаўцы. І найперш бачыла, якён цягне пальцамі куткі сваіх вуснаў, расцягваючы іх да немагчымых памераў. І я таксама спяшалася надзець усмешку».

Алена ЦЯРЭНЦЬЕВА